УДК 81’37

# ЛЕКСІКА-СЕМАНТЫЧНАЕ ПОЛЕ «ЧАЛАВЕК» ПРЫ РАЗГЛЯДЗЕ СПАЛУЧАЛЬНАСЦІ МОЎНАЙ АДЗІНКІ Ў ЛЕКСІКА-СЕМАНТЫЧНЫМ АСПЕКЦЕ

***Н. Р. Карнеенка*** (МДУ імя А. А. Куляшова)
Навук. кір. ***І. М. Ячмянёва***,
канд. філалаг. навук, дацэнт

Праблема мастацкага выкарыстання празаікамі і паэтамі выразных магчымасцей слова заўсёды знаходзіцца ў цэнтры ўвагі – сучаснага мовазнаўства. Але спалучальнасць слоў у мове пісьменнікаў пакуль што не стала аб’ектам markerрознабаковых навуковых даследаванняў. Асаблівай увагі заслугоўвае пытанне аб лексічнай спалучальнасці ў яе суадносінах са значэннем слова. Аднак пры лексіка-семантычным аналізе мовы мастацкай літаратуры ў цэнтры ўвагі аказваецца не толькі значэнне слова, але і яго розныя дадатковыя эмацыянальна-ацэначныя і стылёвыя адценні. Асноўным сродкам актуалізацыі семантыкі слоў з’яўляюцца іх сінтагматычныя сувязі, у якіх сістэмныя значэнні слоў дапаўняюцца і відазмяняюцца рознага роду «прырашчэннямі» – сэнсу і эмацыянальна-ацэначных адценняў. У кантэксце словы могуць трансфармаваць свае значэнні, ускладняць зместавую структуру, набываць новыя семантычныя адценні.

У цэнтры ўвагі лексіка-семантычнае поле «Чалавек», менавіта тыя яго лексічныя кампаненты, якія служаць назвамі чалавечых пачуццяў і эмоцый. Намінацыя эмоцый уваходзіць у склад любога мастацкага твора, паколькі ў цэнтры яго ўвагі стаіць чалавек са сваімі пачуццямі і перажываннямі. Асабліва важнай



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

для даследавання з'яўляецца тая акалічнасць, што ў мастацкім творы гарманічна аб'ядноўваюцца апісанні з'яў рэчаіснасці і асобы аўтара, якая праяўляецца ў тэме, структуры, сюжэце, кампазіцыі, характарах, наогул у ідэі ўсяго мастацкага тэксту. Апісанне эмацыянальнага стану чалавека патрабуе пэўнага набору моўных кампанентаў, якія апісваюць і ў той жа час арганізуюць унутраны свет чалавека.

Мікраполе «Пачуцці» разглядаецца як сістэмная структура мовы, у якой аб'яднаны элементы моўнага выражэння разнастайных пачуццяў. Дамінантай у гэтым мікраполі выступае назоўнік *пачуццё*. Пад пачуццямі разумеюцца ўстойлівыя эмацыянальныя адносіны чалавека да з'яў рэчаіснасці, якія адлюстроўваюць іх значэнне ў сувязі з яго патрабаваннямі і матывамі. Эмацыянальнасць як факт псіхікі адлюстроўваецца ў семантыцы моўных адзінак. У мікраполе «Пачуцці» ўваходзяць лексіка-семантычныя групы разнастайных эмоцый, элементы якіх аб'яднаны сігніфікатыўнай агульнасцю. Кожная група мае ў сваім цэнтры гіперонім з больш абагуленым значэннем. Адной з асноўных станоўчых эмоцый чалавека з'яўляецца *радасць*. Слоўнікавымі эквівалентамі лексемы *радасць* з'яўляюцца *каханне, задавальненне, захапленне, шчасце.*

Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова